# Сёння адбылося асвячэння Варварынскай крыніцы



**Штогод на трэці дзень Святой Тройцы непадалёку ад населенага пункту Гадзічава праходзіць рытуал асвячэння Варварынская краніцы.**

Калі з’явілася Варварынская крыніца дакладна ніхто не памятае. Гаючыя ўласцівасці яе вады мясцовыя жыхары ведаюць даўно і ўстанавілі крыж з іконай Вялікамучаніцы Варвары, таму крыніцу і называюць Варварынскай.

На гэты крыж завязваюць аброчныя ручнікі, калі просяць, каб Вялікамучаніца Варвара дапамагла ў бядзе, збавіла ад хваробы. Раней у крыніцу з гэтай мэтай кідалі капейкі. Кожны год на трэці дзень Тройцы служыцца малебен і асвячаецца вада. За гаючай вадой прыязджаюці не толькі мясцовыя жыхары, але і з Гомеля і Чарнігава.

Існуе паданне, што нейкай манашцы аднаго з Чарнігаўскіх

манастыроў прысніўся сон, што ў гэтым месцы неабходна знайсці крыніцу з гаючай вадой. І калі яна прыйшла ў гэтае месца, там сапраўды з’явілася крыніца. Яшчэ расказваюць, што з надзеяй вылечыцца ад цяжкаў хваробы ног прыехала жанчына з Урала: яна пабачыла ў сне, што вылечыць сваю хваробу, калі пап’е вады з гэтай крыніцы. Яна прыбыла сюды з вялікай надзеяй і гаючая вада ёй дапамагла.






МЧС


Помощь
Пресвятой
Богородицы


ГОМЕЛЬСКИЙ
РАЙОН





Варварынская крыніца ўжо некалькі разоў мяняла сваё месца. Калі недалёка ад яе будавалі дарогу, зрабілі насып, крынічка

знікла. Прыехалі веруючыя, а крыніцы няма. Тады адна манахіня стала маліцца, па яе прыкладу да Бога звярнуліся і іншыя. І праз некаторы час заўважылі, што недалёка ад былога месца з’явілася крыніца. Пазней яна зноў крыху змяніла сваё месца.

**Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ**

**http://sozhnews.by**